# *ВОПРОСЫ СТИЛИСТИКИ И КУЛЬТУРЫ РЕЧИ В ПРЕПОДАВАНИИ ЛИНГВИСТИЧЕСКИХ ДИСЦИПЛИН*

УДК 821.161.3.09-84

## Канцэпт воля ў беларускіх мастацкіх тэкстах

Н.В. Гаўрош, Н.М. Нямковіч
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт
Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка

Веды людзей пра аб’ектыўную рэальнасць арганізаваны ў выглядзе канцэптаў – абстрактных ментальных структур, якія адлюстроўваюць розныя сферы дзейнасці чалавека. Чалавек мысліць канцэптамі, камбінуе іх, фарміруе новыя канцэпты ў ходзе пазнання свету.

Любая нацыянальная мова вызначае кагнітыўныя аб’ёмы і вербалізуе канцэпты ў характэрным толькі для яе выглядзе, спецыфічна адлюстроўваючы аб’ектыўную рэальнасць, і такім чынам выступае як сукупнасць ведаў пэўнага грамадства, этнасу [4, с. 28]. Канцэпт мае складаную кампазіцыю, якой ”з аднаго боку, належыць усё, што належыць будове паняццяў; з другога боку, у структуру канцэпту ўваходзіць усё тое, што робіць яго фактам культуры” [5, с. 40]. Канцэпты “як ментальныя ўтварэнні могуць існаваць толькі ў форме іх сукупнасцей” [6, с. 36], якія складаюць, паводле Ліхачова Д.С. [5, с. 285], канцэптасферу народа.

Канцэпт як спецыфічнае ўтварэнне рэпрэзентуе сябе ў плане выражэння ўсёй сукупнасці разнародных моўных

сродкаў – лексічных, фразеалагічных і афарыстычных, з дапамогай якіх ён рэалізуецца ў мове.

Для раскрыцця семантычнага напаўнення канцэпту *воля* спынімся на сістэме лексічных значэнняў сінонімаў *воля, свабода, незалежнасць.*

Канцэпт *воля* ўключаецца ў канцэптасферу беларусаў побач з найважнейшымі і ўніверсальнымі канцэптамі *чалавек, жыццё*. Нягледзячы на сэнсавую блізкасць паняццяў *воля, свабода,* канцэптуальна яны не тоесныя, не ідэнтычныя ні па значэнні, ні па функцыі, што выразна выяўляецца ў супастаўленні іх семантычных палёў.

Канцэпт *воля* – складанае ментальнае ўтварэнне, якое яднае веды пра знешнюю рэальнасць і ўнутраны свет чалавека. Сутнасць канцэпту акрэсліваецца абстрактным (адцягненым) характарам самога слова *воля,* што фіксуе найважнейшыя канцэпты калектыўнага ўсведамлення, звязанага з каштоўнаснай карцінай свету, сэнсам жыцця чалавека. Уяўленні пра адцягненую сутнасць канцэпту *воля* засведчаны ў філасофскіх і навуковых даследаваннях, а ў мастацкім і побытавым светаўспрыманні рэалізуюцца пераважна праз метафарычную і метанімічную спалучальнасць ключавога слова і яго асацыятыўны патэнцыял. У рэлігійнай карціне свету сінанімічныя рады слоў *воля* і *свабода* антанімізуюцца на базе ацэначнага кампанента значэння: *воля* набліжаецца да ўседазволенасці, *свабода* – да маральнасці выбару. У філасофскім светаўспрыманні *воля* аб’ядноўвае ўнутраны і знешні, магчымы і рэальны свет, што разумеецца як дзейсны пачатак чалавека і ўсяго жывога.

Змест канцэпту *воля* раскрываецца праз семантычнае поле, якое, паводле вызначэння ТСБМ, уключае 8 дэфініцый:

1. Свядомае і мэтанакіраванае рэгуляванне чалавекам сваёй дзейнасці. *Сіла волі. Цвёрдая воля*; 2. Жаданне, патрабаванне. *Дыктаваць сваю волю. Апошняя воля*; 3. Улада, права. *Перастаў адчуваць матчыну волю*; 4. Свабода, незалежнасць.

*За волю ў бой ішлі*; 5. *Гіст.* Вызваленне ад прыгоннай залежнасці. *Купіць волю*; 6. Магчымасць дзейнічаць самастойна; 7. Становішча, пры якім жыццё чалавека, птушак абмежавана ўмовамі зняволення. *Выйсці на волю*; 8. Прастор, прыволле, раздолле. *Такая шыр бязмежна... Што крок, то волі знак!* (Колас).

Падаецца 10 устойлівых выразаў з кампанентам *воля*: ***вольнаму воля, вольная воля, воля ваша, даць волю, даць волю рукам, жалезная воля, людзі добрай волі, на волю лёсу, па добрай волі, добрая воля.***

Лексема *воля* (побач з іншымі кампанентамі) стала базай для ўтварэння роднасных слоў *вольна, вольнаадпушчанік, вольнаадпушчаніца, вольнаадпушчаны, вольналюбівы, вольнасць, вольніца...* Заўважым: нягледзячы на тое, што роднасныя словы раскрываюць даволі багатую семантычную напоўненасць лексемы, назоўнік *воля* ўступае ў сінанімічныя адносіны толькі з словамі *вольнасць, вольніца, свабода* [3, с. 374].

Значную ролю ў раскрыцці сутнасці канцэпту *воля* адыгрываюць вобразныя азначэнні – эпітэты, з дапамогай якіх праз мастацкі тэкст адлюстроўваецца моўная карціна свету: сістэма нацыянальных арыенціраў і ўзаемаадносін чалавека ў свеце і да свету, матывы, ацэнкі, накіраваныя на пошукі стэрэатыпу, эталона, якія служаць мастком паміж умоўнаю і канцэптуальнаю карцінамі свету. Вылучаюцца агульнамоўныя вобразныя азначэнні, пераважна метафарычныя, якія выяўляюць наступную семантыку слова *воля* ‘свабода, незалежнасць, настойлівасць у дзейнасці, у пераадоленні перашкод’ са станоўчай і адмоўнай характарыстыкай: *арліная, вольная, залатая, звонкая, светлая, хмельная, шчырая*; **жудасная; аграмадная, гранітная, жалезная, неадольная, непахісная, неўміручая, неўтаймаваная, нязломная, тытанічная, фантастычная, цвёрдая; * упартая: Дайце мне волю, дайце арліную, вырвіце з*

*путаў, акоў!* (Я. Купала). *Любіцьму волю* ***вольную*** *да скону, Ды над каханнем узвышаў яе дарма* (В. Жуковіч). *Жыве ў Гіпербарэі люд дзівосны, якому не балюча паміраць, калі ў яго забраць жадаюць долю... І родны гай, і* ***залатую*** *волю!* (У. Караткевіч). *Гэта памяць –* ***звонкая*** *воля. Гэту памяць ваякам не закрэсліць* (В. Зуёнак). *Толькі ж мне няма* ***светлай*** *волечкі* (Я. Колас). *Здавалася, у самім паветры звінела* ***хмельная*** *воля* (Я. Колас). *Пяюць* [паэты] *аб шчасці, добрай долі, аб волі* ***шчырай*** *для людзей* (Я. Купала). *І як мне добра, што тут, у пустыні, на гэтай* ***жудаснай*** *волі ёсць хоць адзін чалавек* (Я. Брыль). *Можна толькі здзіўляцца і захапляцца той* ***аграмаднай*** *воляй і настойлівасцю, з якой Уладзімір Дубоўка працаваў дзеля шчасця і росквіту нашай Айчыны* (Ю. Пшыркоў). *Гэтая* ***гранітная*** *воля свой гарт набыла ў барацьбе* (Я. Колас). *А воля мне* ***жалезная*** *патрэбна за крыўду маёй мілай заплаціць* (Я. Купала). *Наша воля* ***неўміруча****, хоць і пад замкамі* (М. Хведаровіч). *Любоў мая! Я свет табе пакіну* ***неўтаймаванай*** *воляю дарма* (В. Вярба). *І волі маёй* ***непахіснай*** *не хопіць, каб гора пазбыць* (“Маладосць”). *Патрэбна была сапраўды* ***тытанічная, ******фантастычная*** *воля лепшых сыноў Беларусі, каб адстаяць яе незалежнасць, зберагчы неацэнную спадчыну* (“Беларусь”).

Індывідуальна аўтарскія вобразныя азначэнні адлюстроўваюць нацыянальную спецыфіку твора пісьменніка, асаблівасці яго мастацкага асэнсавання рэчаіснасці: *Зашумелі, загудзелі, як віхор, сусветны, не праспалі ў пасцелі волі* ***агняцветнай*** (Я. Купала). *Сопкі, скалы, валуны. Глядзіш, і такое ўражанне ў цябе, што тут прайшоў... волат: ён ніколі ўжо не вернецца сюды, але ўсё тут жыве ягонгай* ***безнадзейна-разгульнай*** *воляй* (М. Стральцоў).

Для выяўлення сутнасці канцэпту *воля* надзвычай прыдатныя афарыстычныя выслоўі, у якіх заключаны найвялікшыя агульначалавечыя каштоўнасці – філасофія і

мудрасць жыцця цэлага народа і асобнага чалавека, яго этычныя і эстэтычныя прынцыпы, духоўнасць, культура, традыцыі, якія падаюцца як асноўныя жыццёвыя формулы, як дамінантныя вартасці. Яны – канцэпты – сталі *тэмай* для многіх афарыстычных формул. Натуральна, што такое шматаспектнае паняцце, як *воля*, прадугледжвае розныя расшыфроўкі-тлумачэнні, таму ў творах беларускіх пісьменнікаў самыя разнастайныя варыяцыі на гэтую тэму.

Як паказвае даследаваны матэрыял, *воля* найперш – гэта ўнутраны стан чалавечай душы, яе раскаванасць, найвышэйшая каштоўнасць, якая дае магчымасць асобе ажыццяўляць свае самыя чыстыя душэўныя памкненні, намеры, сцвердзіць сябе як створаную Богам істоту з даравaнай ёй воляй (нярэдка раскрыццю семантыкі назоўніка *воля* спрыяе аднакаранёвы прыметнік *вольны*): *Воля сонейку раўня* (Я. Купала). *Воля – не тое, што рукі развяжуць, / зменяць на большую клетку малую. / Воля – не тое, што / “вольны ты” – скажуць. / Воля – то воля, якую адчую* (Л. Геніюш). *Лёс абачлівых выбірае, / Ды бывае... – то воля нябёс? – / Неабачліваму спрыяе. /Усё ж разважлівых больш любіць лёс* (Н. Маеўская). *Волі не ведае вольны* (У. Някляеў). *Нам у вольных дрэў павучыцца, / Як за родную зямлю тры-мацца...* (Р. Барадулін).

Слушна сцвярджаюць афарысты, што воля не кожнаму дадзена, воля неацэнная, яна не для ўсіх, а толькі для чыстых сэрцам, моцных духам: *Праўда – люксус для выбра-ных, / воля – капрыз адзінак* (Л. Геніюш). *Толькі воля не ведае здрады* (В. Жуковіч). *Толькі нішто не пагасіць ніколі / ў сэрцы гаручага полымя волі* (М. Танк). *Хай лепей ніколі не будзе краіны, / Чым будзе краіна – без волі* (У. Караткевіч). *Хто не любіць волі, – не нашага роду* (Я. Купала). *Чалавек моцнай волі... Чалавек, які можа памерці, калі захоча, і які не памрэ, як бы да гэтага ні прымушалі абставіны* (Г. Марчук). *Якая ты ўсё ж неацэнная, Воля, / Калі за скарынку цябе*

*прадаюць!* (С. Законнікаў). *Вольнаму – воля. Шалёнаму – поле. Святому – рай. Шчасліваму – доля. Пчолцы – кветка. Салаўю – май. Рыбе – вада. А што падкідышу?* (У. Ліпскі).

Чалавек абавязаны берагчы сваю волю, змагацца за яе і, калі будзе наканавана лёсам, памерці за яе, бо толькі вольны духам – сапраўдны чалавек: *Кропля крыві, / што праліта за волю, святая...* (С. Законнікаў). *За волю, веды плацяць галавой* (Н. Мацяш). *Не прарасце быльнёг, / Дзе ёсць душа і воля!* (А. Звонак). *Навошта ж воля для жанчыны, / Калі ёй цэлы свет чужы* (Я. Янішчыц). *Будзь смелым, як вецер, як воля сама! / Знай, смелых не чэпе ні крыўда, ні цьма!* (Я. Купала). *Сцежка да волі надта цяжкая...* (С. Законнікаў). *Так, той толькі жне, хто пасее./ Не, рукі ў сяўца не дрыжаць, / пасеяць ён горкую праўду паспее, / каб волю жаданую жаць* (В. Жуковіч). *Шануй здабытую ў змаганнях волю – / Цябе і праз вякі нашчадкі ўспомняць* (С. Законнікаў).

Воля – гэта і сіла духу чалавека. Актуалізацыя сэнсу слова *воля* ‘сіла, неад’емная рыса, сутнасць чалавека’ ў наступных афарызмах: *Няма для духа вольнага граніцы, меры* (Я. Купала). *На зямлі існуе адзіная непапраўнасць, адзіная незваротнасць. Гэта смерць. Пакуль яна не прыйшла – усё можа змяніцца тваёй воляй або капрызам лёсу* (У. Караткевіч). *Хто волю верна сніць, / Працят лятункам аб вялікім, / Таго не спакусіць / Ні ўладай, ні дабром бязлікім* (У. Жылка). *Як добра было б жыць на свеце, калі б чалавека не гналі, не крыўдзілі, не пазбаўлялі волі* (Я. Колас). *Якія нягоды і пакуты могуць спыніць чалавека, калі наперадзе ў яго воля?!* (Я. Сіпакоў).

Сутнасць канцэпту *воля*, яго сэнсавую напоўненасць выяўляюць антанімічныя апазіцыі *вольны – нявольнік, воля – няволя, воля – прыгнёт, воля – палон, воля – турма, разняволенне, ярмо;* прычым не заўсёды абодва антонімы, у тым ліку і кантэкстуальныя, могуць мець слоўнае выражэнне: *Страшны... не той палон, у які цябе заключае нехта, а*

*страшны той палон, у які заганяе сам сябе чалавек. Можна быць нявольнікам і на волі, можна быць вольным у няволі* (Б. Сачанка). *Няхай галодная – ды воля, / Чым сытая – але турма!* (В. Вярба). *Самотніку не вырвацца з няволі* (Р. Барадулін). *Калі раб у веры, / Дык у чым жа вольны?!* (Н. Мацяш). *Вучыся, нябожа, вучэнне паможа / Змагацца з нядоляй, няволяй* (Я. Купала). *А ці лягчэй нявольніку тады, / Калі на ім аковы залатыя?* (П. Макаль). *Разняволенне – / гэта / адраджэння пачатак* (В. Жуковіч). *Вол прывыкае да ярма – / Як распрагуць, яму нязвычна, / Здаецца, выпраглі дарма* (М. Лужанін). *Пасада – заўсёды няволя* (М. Башлакоў). *Чым жыць і гінуць век у кайданах, / Лепш вольным пасці* (М. Танк).

Семантычнае поле слова *свабода*, паводле вызначэння ТСБМ, ілюструюць наступныя дэфініцыі: 1. Магчымасць ажыццяўлення чалавекам сваіх мэт і імкненняў на аснове пазнання законаў развіцця прыроды і грамадства. *Свабода ёсць усведамленне неабходнасці.*; 2. Адсутнасць палітычнага і эканамічнага прыгнёту, абмежаванняў у грамадска-палітычным жыцці і дзейнасці якога-н. класа ці грамадства ў цэлым. *Па гэтым гасцінцы паліцыянты ганялі скаваную моладзь – барацьбітоў за свабоду народа* (Я. Брыль); 3. Дзяржаўная незалежнасць, суверэнітэт; 4. Магчымасць дзейнічаць у якой-н. галіне бесперашкодна, без абмежаванняў, забароны. *Свабода друку*; 5. Абсалютная незалежнасць, самастойнасць. // Магчымасць рабіць, паступаць па сваёй волі; адсутнасць абмежаванняў у чым-н.

Пра значную насычанасць аб'ёму паняцця *свабода* сведчаць і аднакаранёвыя словы *свабодалюбівы, свабодалюбнасць, свабодалюбны, свабодалюбства, свабодамыснасць, свабодамысны, свабодны.*

Пры апісанні паняцця *свабода* як састаўной часткі канцэпту *воля* мэтазгодна ўлічваць тры асноўныя яго кампаненты: чалавек як носьбіт свабоды; перашкоды, што ўзнікаюць на шляху ажыццяўлення свабоды дзеяння; сфера

існавання чалавека, дзе ёсць або няма свабоды. У залежнасці ад сферы, у якой рэалізуецца свабода, неабходна адрозніваць: фізічную свабоду (незалежную ад волі чалавека), унутраную свабоду (свабоду ад перажыванняў, пачуццяў, думак), індвідуальную свабоду ў сацыяльнай сферы (праяўленне індывідуальнай свабоднай дзейнасці), калектыўную свабоду (свабода грамадства).

Актуалізацыя паняцця *свабода* непасрэдна звязана з узаемаадносінамі чалавека і грамадства, яго роляй у жыцці краіны, з яго адказнасцю за лёс свайго народа, нацыі. І гэта выразна акрэсліваюць афарыстычныя выслоўі беларускіх пісьменнікаў. Выдзелім асноўныя аспекты:

– свабода – гэта сіла духу чалавека, якую трэба заваёўваць і абараняць: *Бяруць свабоду сілай духу, / Бяруць са зброяй у руках* (А. Звонак). *Грудзьмі свабоду прыкрываў* (К. Крапіва). *Няхай жыве, заўжды жыве / жаданая свабода духу!* (А. Русецкі). *Свабоду па закону не даюць* (З. Марозаў). *Свабоду зроду / Ніхто ахвотна не даваў* (А. Звонак). *У свабоды адзін абаронца – праўда* (Г. Марчук). *Свабодны толькі дух – / Душа не мае волі* (Р. Барадулін). *Свабоды бог з неба не скіне* (Я. Колас);

– гэта спадчынная, нацыянальная адметнасць: *Сама гісторыя вучыла: / Шануй, народзе, і цані – / Усё, што поіцьжывіць шчыра / Тваёй свабоды карані!* (Н. Гілевіч). *І на іншых вяршынях суровых / (Вера! Роўнасць! Свабода! Край!) / Ты струменьчык матчынай мовы, / Быццам маці, не забывай* (У. Караткевіч);

– гэта грамадская катэгорыя, неад’емнасць кожнай дэмакратыі, незалежнасці дзяржавы: *Свабода нашай дэмакратыі – гэта свабода агню, а дзе ж свабода вады?* (Г. Марчук). *Свабодзе нашай грош цана, / калі яна адносная* (В. Жуковіч). *Дэмакратыя пачынаецца, калі ад слоў пераходзяць да справы, а канчаецца, калі ад спраў пераходзяць да слоў* (Г. Марчук);

– гэта ўнутраны стан чалавека, яго існасць (нярдка выражаецца антонімамі *несвабодны, непрыгонны* і прачытваецца толькі ў падтэксце): *Чалавек свабодны толькі на адзіноце* (У. Рубанаў). *Чаму ж ты там нішто, дух непрыгонны, / Дзе дружна звонячы ў кайданы ўсімі тоны, / Крывёй, пажарамі частуе раба раб?* (Я. Купала). *О, лепей дні пакончыць на полі баявым, / Ніж век глытаць у кайданах / Чужынскіх вогнішч дым!* (У. Караткевіч).

Так склалася, што праблема незалежнасці (суверэннасці) была актуальнай для нашай краіны на розных этапах яе гістарычнага развіцця. Таму ўключэнне ў структуру канцэпту *воля* кампанента *незалежнасць* бачыцца больш чым мэтазгодным.

Аналіз зместу, сэнсавага напаўнення канцэпту *воля* дае падставы сцвярджаць, што змена структуры канцэптаў, іх актуалізацыя ў нацыянальнай канцэптасферы звязана з агульным развіццём грамадства ў пэўную эпоху, з узроўнем нацыянальнай культуры народа: *Шлях, які мы праходзім, застаецца не па-за намі, а становіцца намі самімі – адкладваецца і акумулюецца ў нас, нібы ў колцах дрэва пражытыя ім гады, і толькі таму ён пройдзены, і толькі таму мы здольныя і вольныя ісці далей* (А. Разанаў).

## Літаратура

1. Гаўрош, Н.В. Афарыстычныя выслоўі беларусмкіх пісьменнікаў / Н.В. Гаўрош, Н.М. Нямковіч. – Мн.: Выш. шк., 1988. – 638 с.

2. Гаўрош, Н.В. Слоўнік эпітэтаў беларускай мовы / Н.В. Гаўрош. – Мн.: Выш. шк., 1988. – 603 с.

3. Клышка, М.К. Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў / М.К. Клышка. – Мн.: Выш. шк., 1976. – 592 с.

4. Колшанский, Г.В. Объективная картина мира в познании и языке / Г.В. Колшанский.– М.: Наука, 1990. – С. 28.

5. Лихачев, Д.С. Концептосфера русского языка / Д.С. Лихачев // Русская словесность. От теории словесности к структуре текста. Антология. – М.: Academia, 1997. – С. 280 – 287.

6. Ляшчынская, В.А. Фразеалагічная эмацыянальная канцэптасфера беларусаў / В.А. Ляшчынская. Мінск: РИВШ, 2012. – 246 с.

7. Степанов, Ю.С. Константы. Словарь русской культуры / Ю.С. Степанов. – М., 1997. – С. 40.

8. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы ў пяці тамах. – Мн.: БелСЭ, Т.1, 1977. – 608 с.; Т.5, кн.1, 1983. – 663 с.